


ГРАМАДСТВА

# «Інфармацыя, якая парушае палітычныя перакананні». Ідэолагі знайшлі палітычную рэкламу на таварах у краме «Адметнасць»

26 КРАСАВІКА 2021, 13:17

**Гродзенская крама сувеніраў і адзення ў нацыянальным стылі «Адметнасць» атрымала прадпісанне з аддзела ідэалогіі Гродзенскага гарвыканкама. У ім сказана, што на таварах размешчана палітычная рэклама з парушэннем Закона аб рэкламе.**

> *«Так, на прапанаваных да продажу прадметах адзення і сувенірнай прадукцыі змяшчаецца інфармацыя, якая парушае палітычныя і іншыя перакананні грамадзян», — сказана ў дакуменце.*

Парушэнне выявілі ў час маніторынгу 21 красавіка на прадмет выканання заканадаўства, удакладняюць у прадпісанні. «Аказваецца, у нас быў маніторынг!», — абураецца супрацоўніца крамы **Вольга Верамеенка**.

Аддзел ідэалагічнай работы і па справах моладзі гарвыканкама адзначае парушэнне арт. 26 п. 3 Закона аб рэкламе (Неналежная рэклама). За парушэнне для індывідуальнага прадпрымальніка прадугледжаны штраф ад 10 да 20 базавых велічынь (ад 290 да 580 рублёў). Упраўленне гандлю і паслуг гарвыканкама загадвае ліквідаваць парушэнне ў трохдзённы тэрмін. Таксама цягам сямі дзён трэба пісьмова інфармаваць аддзел ідэалогіі аб прынятых мерах.

У краме распавялі, што пакуль не разумеюць, што рабіць. У дакуменце не тлумачаць, пра якую менавіта інфармацыю і на якіх прадметах ідзе гаворка. Уласнік крамы Сяргей Верамеенка збіраецца раіцца з юрыстамі.

Датэлефанавацца ў аддзел ідэалагічнай працы гарвыканкама і атрымаць там каментар **Hrodna.life** не ўдалося.

## Другая прэтэнзія за тыдзень

21 красавіка «Адметнасць» атрымала запыт ад упраўлення гандлю гарвыканкама на прадастаўленне інфармацыі ў сувязі з атрыманымі скаргамі. Скаргі на продаж бел-чырвона-белай сімволікі гарадскія ўлады атрымалі ад Аляксандра Кавалёва з вёскі Бігосава Верхнедзвінскага раёна (Віцебская вобласць). Ён назваў бела-чырвона-белы сцяг «пранацысцка-пратэстным».

Аляксандр Кавалёў за апошні час напісаў пяць розных скаргаў на бела-чырвона-белую сімволіку, прычым сярод іх ёсць скарга на заўзятара маскоўскага «Спартака». Шмат зваротаў прысвечаны сэнсу і паходжанню лозунгу «Жыве Беларусь!». Таксама ён аўтар петыцыі на change.org з просьбай аб імпічменце Аляксандру Лукашэнку і ўсталяванні ў Беларусі парламенцкай рэспублікі. Кавалёў склаў электронны зварот у Палату прадстаўнікоў аб адмене тэхагляду, піша «Еўрарадыё».

**Чытайце таксама: Гродненский магазин «Адметнасць «ответил на жалобу по поводу «пронацистско-протестных «флагов**

Крама «Адметнасць» працуе ў цэнтры Гродна з 2018 года. Яна спецыялізуецца на продажы сувеніраў з гістарычнай нацыянальнай беларускай сімволікай, адзення з арнаментам, рэчаў ручной працы. За апошні год многія падобныя крамы ў Беларусі зачынілі ў сувязі з рознымі прычынамі з боку ўладаў.

БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ 2020-ГА | БІЗНЕС | ГРАМАДСТВА

❤ 0

## РАІМ ПАЧЫТАЦЬ

**Бондарава дамаглася, каб «Еўраопт» змяніў сваю рэкламу. Але на гэтым яна не спыняецца (абноўлена)**

**«Гроднажылбуд» прыдумаў, як паспрыяць развіццю малога бізнесу ў мікрараёнах**

**У Conte з’явілася рэклама з Аляксандрай Борціч... і хутка знікла. Што адбылося?**

## АПОШНІЯ ЗАПІСЫ

**У Гродне затрымалі замежніка. Пагражаюць дэпартацыяй і пазбаўленнем віду на жыхарства**

2 ВЕРАСНЯ 2023, 12:48

**Гродзенцаў пачалі выклікаць у ДФР за данаты ў BYSOL**

1 ВЕРАСНЯ 2023, 20:42

**На «Прывалцы» запрацавала абавязковая дэзінфекцыя аўто. Пакуль — бясплатна, але ненадоўга**

1 ВЕРАСНЯ 2023, 17:57

**Намеснік дырэктара фірмы «КліматМайстар» затрыманы ў Гродне (абноўлена)**

31 ЖНІЎНЯ 2023, 17:55

2016-2023 Выкарыстанне матэрыялаў сайта дазваляецца паводле правілаў ліцэнзіі Creative Commons BY-SA 4.0 Int са спасылкай на крыніцу і ўказаннем аўтара. Падрабязныя правілы перадруку тут .